Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

2 СНЕЖНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 233 (28343)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Як пражыць зіму бяспечна?

СТАР. 3



## Калі стары — чужы сярод сваіх

СТАР. 13



## Праграма тэлебачання на тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь:**

*«Пасля ўступлення ў сілу Мытнага кодэкса Еўразійскага эканамічнага саюза мытныя органы Беларусі пяройдуць ад эксперыменту да поўнамаштабнага прымянення аўтаматычнага выпуску тавараў, што перамяшчаюцца праз мяжу ЕАЭС, які павінен дасягнуць да 2020 года не менш як 25%».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | - 1° |
| Віцебск | - 3° |
| Гомель | - 2° |
| Гродна | - 2° |
| Магілёў | - 3° |
| Мінск | - 2° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.12.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9627 ▼ |
| Еўра | 2,0815 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0307 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0765 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# СКАРБОНКА ЯРКІХ ІДЭЙ



Фота БЕЛТА.

**Больш за 30 інавацыйных праектаў прадставіла моладзь Магілёўскай вобласці 1 снежня на выстаўцы-прэзентацыі абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі». Маладыя крэатыўшчыкі і рацыяналізатары прадставілі ідэі і праекты, якія плануюць рэалізаваць у найбліжэйшай перспектыве і якія знаходзяцца ў стадыі ўкаранення і нават камерцыялізацыі. Па выніках пасяджэння абласнога экспертнага савета аўтарам праектаў будуць уручаны сертыфікаты ўдзельнікаў абласной выстаўкі-прэзентацыі «Ідэі Магілёўшчыны — 2016». Найбольш перспектыўныя атрымаюць пуцёўкі для ўдзелу ў рэспубліканскім фінале конкурсу, а аўтараў самых лепшых праектаў адзначаць падарункамі ад абласнога камітэта БРСМ і партнёраў.**

***На фота:*** **навучэнец сярэдняй школы №34 г. Магілёва Ілья ТУПАЛЬСКІ прадставіў гасцініцу для кветак.**

■ Векапомнае

## «ЗНОЎ БУДЗЕМ ШЧАСЦЕ МЕЦЬ І ВОЛЮ...»

### У музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адкрылася выстава, прысвечаная Янку Купалу

**Вялікая Айчынная вайна стала асабістай трагедыяй для першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Ён вымушаны быў з'ехаць, страціць свой дом, лецішча, а разам з ім і ўнікальны архіў, бібліятэку. Але больш за ўсё класік айчыннай літаратуры перажываў за тое, што ў акупаваным Мінску засталася яго маці...**

Яны больш так і не ўбачыліся. Выпадковасць ці не, але жыццё Бянігны Іванаўны, маці Янкі Купалы, абарвалася на другі дзень, як не стала яе сына. Згодна з афіцыйнай версіяй, на той свет яна пайшла, так і не атрымаўшы сумнай навіны. У Мінску ўжо ведалі пра тое, што паэта не стала, але ёй проста баяліся пра гэта казаць.

Іх хавалі ў адзін дзень — 1 ліпеня 1942 года. Янку Купалу — у Маскве, Бянігну Іванаўну — у Мінску. Праз 20 гадоў маці і сын «сустрэліся» на Вайсковых могілках беларускай сталіцы.

І дагэтуль няма адзінай версіі, што здарылася ў той ракавы чэрвеньскі вечар, які стаў апошнім для паэта. Кавалак паркету з гасцініцы «Масква», дзе абарвалася жыццё класіка, экспануецца на выставе «На мой кліч вечавы...», якая размясцілася ў сценах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Экспазіцыя, прысвечаная жыццю і творчасці першага народнага паэта Беларусі ў перадваенны час і ў першыя гады Вялікай Айчыннай, — сумесны праект музея з Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы.

СТАР. 4

■ Працяг тэмы

## СУВЕНІР З ЛЁСАМ

### На Гомельшчыне абвешчаны конкурс, у якім могуць прыняць удзел рамеснікі з усёй краіны

**У абласным аддзяленні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты (БелГПП) абяцаюць, што пераможцаў чакаюць не толькі прызы, але і шырокія магчымасці прадстаўляць свае вырабы на выставах, у тым ліку за мяжой.**

**Дарэчы, размова пра сувенір для замежніка, якую мы пачалі на старонках газеты (12.11.2016), атрымала працяг на дзяржаўным узроўні. Асабіста для мяне было важна даведацца, што разавыя безвыніковыя пошукі на паліцах крам нечага адметнага, беларускага — не мой суб'ектыўны погляд на праблему. Адказы на асобныя пытанні, якія ўзніклі раней, былі знойдзены падчас круглага стала «Вытворчасць сувенірнай прадукцыі: праблемы, рэаліі, перспектывы», які правялі ў Гомелі. Праўда, яшчэ больш пытанняў нарадзілася пасля.**

**Пошукамі вартых беларускіх сувеніраў куды часцей, чым мне, прыходзіцца займацца тым, хто рыхтуе візіты нашых дэлегацый, якія выязджаюць за межы краіны ці прадстаўляюць яе. І, аказваецца, яны сутыкаюцца з такімі ж пытаннямі: як знайсці нешта, што не толькі створыць станоўчы эмацыянальны настрой у далейшых стасунках, але і прадставіць у добрым святле менавіта нашу краіну.**



Неглюбскія пернікі.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# МОЦНЫЯ, ФУНДАМЕНТАЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ

**ўстаноўлены паміж Беларуссю і Азербайджанам**

**Пра гэта заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Азербайджана ў Беларусі Ісфандзіярам Вагабзадэ з нагоды завяршэння яго дыпламатычнай місіі ў нашай краіне.**

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што апошнія шэсць гадоў былі «найбольш бурнымі ў адносінах паміж Беларуссю і Азербайджанам». «У гэты час мы закладвалі аснову для моцных, фундаментальных адносін, за што я Вам удзячны», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на важнасць праведзенага на днях візіту ў Баку. «Мы вярнуліся з Вашай радзімы. Думаю, што Беларусь стане Вашай другой радзімай, бо Вы тут працавалі каля 6 гадоў. Яшчэ не было такога выпадку, каб пасол, прапрацаваўшы столькі гадоў, з'ехаў, не адчуўшы Беларусь сваёй другой радзімай», — заўважыў беларускі лідар.

У сваю чаргу пасол Азербайджана сказаў, што ў час дыпламатычнай місіі вялікую ўвагу ўдзяліў развіццю беларуска-азербайджанскіх культурных сувязяў, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. У прыватнасці, займаўся перакладамі твораў беларускіх класікаў, каб бліжэй пазнаёміць азербайджанцаў з беларускай літаратурай і культурай, што ў цэлым спрыяе ўмацаванню ўзаемаразумення паміж народамі.

З улікам дасягнутых на вышэйшым узроўні дамоўленасцей Беларусь і Азербайджан маюць намер нарасціць узаемны тавараабарот да $700 млн.

# ДОШКА ГОНАРУ Ў НОВЫМ ФАРМАЦЕ

**Палажэнне аб Рэспубліканскай Дошцы гонару выкладзена ў новай рэдакцыі. Адпаведны Указ №435 падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.**

Як паведамляе прэс-служба Прэзідэнта, уводзяцца намінацыі ў перспектыўных галінах у сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця: «сярод арганізацый, якія ажыццяўляюць турыстычную дзейнасць» і «сярод арганізацый, якія ажыццяўляюць выдавецкую дзейнасць».

Вызначаны таксама ўмовы занясення на Рэспубліканскую Дошку гонару. У іх ліку адсутнасць пратэрмінаванай запазычанасці па выплаце заработнай платы на канец кожнага месяца ў справаздачным годзе; адсутнасць у справаздачным годзе фактаў прыцягнення кіраўнікоў і намеснікаў кіраўнікоў адпаведных мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, кіраўнікоў і намеснікаў кіраўнікоў іх структурных падраздзяленняў да крымінальнай адказнасці за ўчыненне карупцыйных злачынстваў альбо вызваленне ад крымінальнай адказнасці за ўчыненне такіх злачынстваў па нерэабілітуючых падставах.

Устаноўлена, што вынікі ў сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця за справаздачны год сярод абласцей і горада Мінска не падводзяцца пры зніжэнні ў цэлым па краіне аб'ёму ВУП да ўзроўню папярэдняга года (у працэнтах).

■ Тры пытанні да ўлады

# ЯСЬ КАСІЎ КАНЮШЫНУ... У ХОЦІМСКІМ РАЁНЕ

**Калі б можна было адным словам ахарактарызаваць кожны раён Магілёўскай вобласці, то Хоцімскі атрымаў бы назву лірычны. Тут няма буйных прадпрыемстваў, але шмат прывабных куточкаў з бярозавымі гаямі і сіневокімі азёрамі. Напэўна, таму гэты край з'яўляецца сталіцай самага душэўнага свята — пераззвону. А яшчэ тут шмат калектываў, якія прапагандуюць народныя традыцыі і мясцовы фальклор. Дарэчы, песню «Касіў Ясь канюшыну» «Песняры» запазычылі менавіта ў хоцімскіх аматараў. Вядомы беларускі пісьменнік Аляксей Пысін нават засведчыў у адным са сваіх эсэ гэты факт. Тут сур'ёзна працуюць над адраджэннем нацыянальнай кухні, збіраюцца стварыць хлебны фестываль... Больш падрабязна пра тутэйшыя дасягненні і перспектывы мы пагутарылі з намеснікам старшыні Хоцімскага райвыканкама па сацыяльных пытаннях Мікалаем ХУЧАВЫМ.**



***— Хоцімскія майстры лічацца аднымі з лепшых у вобласці. Сёлета Гран-пры і тытул абсалютнага пераможцы фінальнага этапу абласнога агляду-конкурсу «Магілёўская лялька ў рэгіянальным строі» атрымала менавіта майстрыха хоцімскага Дома рамёстваў Таццяна Навумава. Якім наогул быў гэты год для творчых калектываў вашага раёна?***

— Дарэчы, перамога Таццяны Навумавай не адзіная на рахунку хоцімскага Дома рамёстваў. Навучэнка студыі «Чароўная саломка» Маргарыта Лупекіна стала другой у міжнародным конкурсе «Дыпломафф», які праводзіўся ў Краснаярску. Яе выкладчыца таксама атрымала дыплом за належную падрыхтоўку ўдзельніцы конкурсу.

Мы папулярызуем нашу народную творчасць не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі. Падчас пятага Міжнароднага форуму «Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства» народны фальклорны калектыў «Вербіца» Іванаўскага сельскага дома культуры быў заўважаны гасцямі з Бранскай вобласці і атрымаў запрашэнне на іх фальклорны фестываль «Дзяснянскі карагод», які адбудзецца налета.

Далёка за межамі раёна вядомы народны ансамбль «Спадчына» Забялышынскага сельскага дома культуры, народны тэатральны калектыў «Прамень». Падзячныя лісты з міжнароднага фестывалю народнай творчасці «Нашы старажытныя сталіцы», які праходзіў у Кастраме, прывезлі ў Хоцімск народны фальклорны ансамбль «Адраджэнне» і мужчынскае трыа «Хлопцы пасялковыя». «Адраджэнне» таксама адзначана дыпломам удзельніка Міжнароднага фестывалю этнічнай музыкі і рамёстваў «Свет Сібіры», які праходзіў у сяле Шушанскім Краснаярскага краю.

***— Прыемна было даведацца, што падрастаючае пакаленне ў Хоцімскім раёне не толькі далучаецца да сваіх спрадвечных каранёў, але і стабільна дэманструе добрыя вынікі ў круглагадовай спартакіядзе школьнікаў. У чым яшчэ лідзіруюць вашы навучэнцы?***

— Сёлета аддзел адукацыі, спорту і турызму нашага райвыканкама восьмы раз заняў прызавое месца сярод раёнаў вобласці па спартакіядзе. Акрамя гэтага, нашы вучні маюць пэўныя поспехі ў галіне навуковых даследаванняў. Мы ганарымся навучэнцамі хоцімскай школы №2 Дзмітрыем Хучавым і Кірылам Старасценкам, якія атрымалі дыпломы 3-й ступені ў секцыі «Беларуская мова» рэспубліканскага конкурсу навукова-даследчых работ. Школьнікі ўдастоены прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Гэта сведчыць, што ўзровень нашых педагогаў досыць высокі. Як прыклад, магу адзначыць нядаўнюю перамогу настаўніка-дэфектолага гэтай жа школы Наталлі Макаранкі на 3-м этапе адкрытага дыстанцыйнага культурна-інфармацыйнага марафону «Культпра-Свет». Яе замалёўка «Прайшла дарогамі вайны» прызнана лепшай у намінацыі «КультСлоў».

***— Цяпер шмат увагі надаецца турызму і аграэкасядзібам. Ваш раён самы экалагічна чысты і адзін з самых прыгожых. Чым прываблівае турыстаў?***

— Вялікім попытам карыстаецца аграсядзіба братоў Марыфа і Арыфа Аліевых, якія займаюцца аграэкатурызмам. Яна знаходзіцца ў маляўнічым месцы ў лесе, побач лазня, возера. Трымаюць у гаспадарцы бычкоў, кароў, зарыбілі сажалку. Прымаюць удзел ва ўсіх мясцовых святах, іх падворак заўсёды шматлюдны. Летась Арыф выкупіў будынак у Хоцімску, дзе збіраецца рабіць маладзёжную і дзіцячую кавярню з нацыянальнай кухняй.

А вось кавярня Шаміля Сулейманава ўжо паспяхова працуе. Прадпрымальнік спецыялізуецца на вырошчванні авечак, і ў яго кавярні можна пакаштаваць сапраўдны азербайджанскі шашлык і плоў, які робяць толькі на Каўказе. Гэта той чалавек, які не баіцца шукаць найбольш перспектыўныя шляхі свайго развіцця. Спрабаваў займацца піламатэрыяламі, вырошчваў бычкоў. Цяпер прапануе паляванне на фазанаў. Стараецца прывабіць турыстаў экзотыкай.

Яшчэ адзін прадпрымальнік Аляксандр Кастэнка нядаўна прэзентаваў аграсядзібу «Белы лебедзь» — у яго адбудаваны цэлы комплекс для адпачынку з альтанкамі, лазняй, спальнымі пакоямі. І ўсё гэта з відам на возера, дзе шмат лебедзяў. Адным словам, умовы для прыёму турыстаў ёсць. Прыязджайце, не пашкадуеце.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# Дыялог з бізнесам

**Беларускія парламентарыі працягнуць актыўна супрацоўнічаць з бізнес-супольнасцю для далейшага паляпшэння падатковага заканадаўства і спрашчэння падатковай сістэмы. Аб гэтым учора заявіла старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Людміла ДАБРЫНІНА на сустрэчы з прадстаўнікамі грамадскай арганізацыі «Асацыяцыя падаткаплацельшчыкаў Украіны». Такім чынам дэпутаты пашыраюць геаграфію супрацоўніцтва з дзелавымі супольнасцямі. Бакі абмеркавалі пытанні ўдасканалення падатковага і бюджэтнага заканадаўства, узаемадзеяння з экспертамі ў заканадаўчым працэсе.**

Людміла Дабрыніна адзначыла, што парламентарыі канструктыўна працуюць у гэтым напрамку з Рэспубліканскай канфедэрацыяй прадпрымальніцтва, якая рэгулярна запрашае іх на разгляд Нацыянальнай платформы бізнесу. Дэпутаты ў сваю чаргу ўважліва вывучаюць прапановы бізнес-супольнасці, у тым ліку прадпрымальнікаў на тэрыторыі іх выбарчых акруг. У прыватнасці, яна падкрэсліла, што ў нашай краіне сёння дзейнічае сапраўды стабільнае падатковае заканадаўства, гэта асабліва важна для бізнесу. Паводле слоў Людмілы Дабрынінай, перад парламентарыямі сёння стаіць задача і надалей захоўваць гэтую стабільнасць, не павялічваць падатковую нагрузку на эканоміку, а займацца далейшым спрашчэннем падатковага адміністравання. Спікер заўважыла, што доля прыватнага бізнесу ў эканоміцы Беларусі цяпер складае каля 30%. Але нам ёсць куды расці, бо ў еўрапейскіх краінах гэта доля дасягае 50% і нават 70%. Яна таксама паведаміла, што ў сярэдзіне снежня Палата прадстаўнікоў будзе разглядаць законапраект аб інвестыцыйных фондах, што паспрые развіццю прыватнай ініцыятывы.

Акрамя таго, дэпутат звярнула ўвагу, што сёлета ўдалося дасягнуць пэўнай устойлівасці і ў грашова-крэдытнай палітыцы, калі стаўка рэфінансавання Нацбанка знізілася некалькі разоў. У сваю чаргу гэта дазволіла павялічыць даступнасць крэдытаў для малога і сярэдняга бізнесу, чым прадпрымальнікі не прамінулі скарыстацца. Людміла Дабрыніна выказала ўпэўненасць, што калі такая дынаміка захаваецца, то значныя зрухі будуць дасягнуты і ў рэалізацыі інвестыцыйных праектаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Кантакты

# МАЛАДЫЯ І АДКАЗНЫЯ

Студэнты Акадэміі кіравання сустрэліся са старшынёй Следчага камітэта

**Мерапрыемства прайшло ў фармаце «адкрытага дыялогу», які арганізуе БРСМ для таго, каб маладыя людзі маглі паўдзельнічаць у дыскусіі і задаць пытанне прадстаўнікам улады. Іван НАСКЕВІЧ, старшыня Следчага камітэта, расказаў пра ідэю адкрыць філіял кафедры Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце на базе камітэта.**

Як плануецца, гэты філіял будзе працаваць для таго, каб студэнты маглі атрымаць больш практыкаарыентаваныя веды. Такім чынам, у навучэнцаў Акадэміі кіравання будзе шырокі спектр магчымасцей для ўдзелу ў рабоце Следчага камітэта, у тым ліку ў якасці добраахвотных памочнікаў. Іван Наскевіч расказаў, што рыхтуецца ведамасны акт, у адпаведнасці з якім засноўваецца Інстытут добраахвотных памочнікаў. «Маладыя людзі на гэтай базе будуць мець агульнае ўяўленне, чым займаецца Следчы камітэт, як ён функцыянуе».

Сустрэча ў межах «адкрытага дыялогу» мела і прафарыентацыйны характар. Старшыня Следчага камітэта адзначыў, што яны чакаюць у сябе на працы адукаваных маладых людзей з пачуццём адказнасці да даручанай справы. І пакуль што выпускнікі Акадэміі кіравання апраўдваюць спадзяванні.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Міжнароднае супрацоўніцтва

# НАСТАЎНІКІ БУДУЦЬ СТАЖЫРАВАЦЦА Ў ФРАНЦЫІ

БДПУ і Вышэйшая школа выкладчыцкага складу і адукацыі Акадэміі Ліёна падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве

**Пашыраюцца магчымасці і ў студэнтаў. Акрамя стандартных абменаў, як мяркуецца, будуць прапрацоўваць сумесныя магістарскія праграмы на аснове сеткавага ўзаемадзеяння. Тыя, хто іх асвоіць, змогуць атрымаць двайны дыплом. Дагавор паміж дзвюма ВНУ падпісалі ў сераду, 30 лістапада, падчас І Беларуска-французскага міжрэгіянальнага форуму ў Мінску.**

**Рэктар Вышэйшай школы выкладчыцкага складу і адукацыі Акадэміі Ліёна Ален МУНЬЁТ** адзначыў, што партнёрства з Усходняй Еўропай з'яўляецца вельмі цікавым кірункам. «Я спадзяюся на плённае супрацоўніцтва і вялікія праекты», — падкрэсліў спадар Муньёт.

У сваю чаргу **рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК** расказаў аб сумесных планах у развіцці навукі:

— Мы дамовіліся аб правядзенні сумесных даследаванняў у сферы адукацыі з выхадам на падрыхтоўку сумесных манаграфій і артыкулаў. За апошнія гады БДПУ заключыў 39 дагавароў з рознымі ўніверсітэтамі свету. Я думаю, што гэтая дамова будзе спрыяць пашырэнню і паглыбленню супрацоўніцтва паміж гарадамі-пабрацімамі Мінскам і Ліёнам і, вядома ж, паміж нашымі ўніверсітэтамі.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Грошы

# ТРАЦІЦЬ У МЕСЯЦ БОЛЬШ ЗА 600 РУБЛЁЎ

можа дазволіць сабе толькі кожны восьмы беларус

Белстат падлічыў сярэднедушавыя рэсурсы, якія мае насельніцтва. У статыстыцы ўлічваюцца ўсе жыхары: беспрацоўныя, пенсіянеры, дзеці. Палова беларусаў у трэцім квартале распараджалася сумай, меншай за 350 рублёў у месяц. Ад 350 да 600 рублёў мела 37 працэнтаў насельніцтва. І толькі 13 працэнтаў маглі пахваліцца, што могуць дазволіць сабе пакінуць у краме за месяц больш чым 600 рублёў.

Амаль у шасці працэнтаў беларусаў сярэднедушавыя рэсурсы аказаліся меншымі за бюджэт пражытачнага мінімуму. Трэба сказаць, што колькасць малазабяспечаных вырасла ва ўсіх рэгіёнах. Больш за ўсё іх было ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях — 8,1 і 7,9 працэнта адпаведна. У сталіцы за мяжой беднасці жыве 1,5 працэнта гараджан.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Правілы бяспекі

# Навука пАдаць

**Зімой лепей павольней рухацца, нават спазняючыся на работу, чым паспець... з траўмай у бальніцу. 3—4 чалавекі штодня, як толькі выпадае снег, трапляюць у адзін толькі Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр траўматалогіі і артапедыі.**



Выйдзіце загадзя, каб не спяшацца. Надзеньце правільны абутак (абцас дакладна не для слізкага надвор'я — і без таго мяняе баланс раўнавагі). Сыдзіце на ўзбочыну, калі дарогу не паспелі пачысціць. Вучыцеся падаць не назад ці наперад, а на бок, для чаго трэба паспець сагнуць калені, крыху згрупавацца. Калі не ўмееце правільна падаць, то можаце забісца і на зімовыя віды спорту — лыжы, санкі і канькі хутчэй аднімуць здароўе, чым падораць станоўчыя эмоцыі.

Асцерагайцеся пераломў канечнасцей і пазваночніка ў выніку няўдалага падзення. Асабліва лёгка косці могуць ламацца ў людзей сталага веку, сярод якіх вельмі распаўсюджана такое захворванне, як астэапароз, папярэджвае **намеснік дырэктара РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Леанід ЛОМАЦЬ**. Акрамя таго, зімовая траўма — гэта яшчэ і дарожна-транспартныя здарэнні, узгаранні падчас спроб сагрэцца, абмаражэнні, асабліва ў стане нападпітку, выхад на лёд дзеля сезоннай рыбалкі, парушэнне правілаў бяспекі падчас гульняў і заняткаў спортам.

**Штогод у краіне фіксуецца каля 750 тысяч розных відаў траўмаў, з іх 150 тысяч, або пятая частка, — у дзяцей да 18 гадоў. Ад 50 да 90 дзяцей і падлеткаў становяцца ў выніку інвалідамі, а 159 дзяцей летась загінулі (у апошнія гады гэта лічба вагалася ад 200 да 350).**

Ад знешніх прычын агульная смяротнасць у краіне знізілася на 11,5 працэнта: калі летась загінулі 6758 чалавек, то сёлета 5979. Зніжэнне мела месца і ў гарадах, і на вёсцы. Колькасць выпадкаў утаплення за 9 месяцаў зменшыліся на 19,7 працэнта, самагубстваў — на 5,2 працэнта, атручэння алкаголем — на 10, гібелі ў дарожна-транспартных здарэннях — на 24, падзення — на 22, механічнай асфіксіі — на 15,6, няшчасных здарэнняў на пажарах — на 14,8. Аднак у выніку забойства летась загінулі 230 чалавек, сёлета — 234, ад пашкоджання электрычным токам — 21 і 38 адпаведна.

Немагчыма ізаляваць дзіця ад тых жа заняткаў спортам, але навучыць яго падаць — можна і трэба, адзначае **галоўны пазаштатны дзіцячы артапед-траўматолаг Міністэрства аховы здароўя Дзмітрый ЦЕСАКОЎ**. Дарэчы, і маме з каляскай трэба падумаць, як ёй падаць, калі раптам паслізнулася. У арганізаваных дзіцячых калектывах сітуацыя кантралюецца найлепшым чынам: дзяцей не выводзяць на вуліцу, пакуль не будзе пасыпана навакольная тэрыторыя. Наогул, падзенне дзіцяці — не тое, што падзенне дарослага, яно можа і не траўмаваць, але фарміраваць асцярожнасць і страх як абарону неабходна як мага раней.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ Надвор'е

# НАВАТ УДЗЕНЬ ДА МІНУС 7

## А ў пачатку наступнага тыдня маразы будуць дасягаць мінус 15 градусаў

**Галоўны сіноптык Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлана РЫБАКОВА лічыць, што пачатак снежня сёлета адзначыўся камфортным зімовым надвор'ем са снегам і маразамі.**

Але нас імі ўжо не спужаеш, бо загадзя атрымалі пэўную сінаптычную «прышчэпку». Так, апошні месяц восені быў крыху халаднейшы, чым звычайна, а ападкаў выпала больш за норму. Перыядычна ўсталёўвалася снежнае покрыва, яго вышыня складала ад 3 да 15 см. Першы дзень снежня адзначыўся адлігай, але надалей ізноў пахаладае. Ужо ў пятніцу да нас завітае вільготная і няўстойлівая паветраная маса, а на паўднёвым захадзе Беларусі адчуецца ўплыў атмасферных франтоў. Таму чакаецца снег, мокры снег. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад 0 да мінус 5 градусаў.

А вось класічная зіма прыйдзе да нас у выхадныя. У суботу і нядзелю на большай частцы тэрыторыі пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы паніззіцца да 3—10 марозу, а пры праясненнях — да мінус 13 градусаў. Удзень будзе ад нуля на паўднёвым захадзе да мінус 7 градусаў на паўночным усходзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня надвор'е ў асноўным будуць вызначаць атмасферныя франты, якія змяшчаюцца са Скандынавіі. У панядзелак на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Удзень чакаецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 3—10 градусаў, пры праясненнях — да 11—15 марозу. Удзень спецыялісты прагназуюць ад мінус 5 да 1 цяпла. Праўда ў аўторак да нас прыйдзе ўжо няўстойлівае надвор'е, таму мароз аслабее. На большай частцы тэрыторыі пройдзе снег, па паўднёвым захадзе ападкі будуць у выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 марозу, удзень — ад мінус 4 да 2 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Сталічны час

# Набліжаецца «нашэсце» Дзядоў Марозаў

## А на навагоднія святы экскурсійныя аўтобусныя маршруты Мінска загавораць па-беларуску

**Парад казачных персанажаў ужо стаў для жыхароў сталіцы добрай традыцыяй. У гэты раз ён пройдзе 24 снежня ў 17.30 ад плошчы Незалежнасці да плошчы Свабоды. У фінале гледачы апынуцца ў «Краіне выканання жаданняў», дзе ўбачаць светлавое і піратэхнічнае шоу. Аднак гэта далёка не адзінае, што зможа ўразіць жыхароў сталіцы ў святочныя дні: усяго чакаецца больш за 100 мерапрыемстваў, прымеркаваных да Новага года.**

Па словах **намесніка начальніка ўпраўлення аддзела ўстаноў культуры і культурна-асветніцкай працы Мінгарвыканкама Аляксандра ШАСТАКОВА**, тэматычныя канцэрты, шоу і прадстаўленні будуць нацэлены на розную ўзроставую аўдыторыю. У гарадской Ратушы з 24 снежня па 5 студзеня будзе арганізаваны таямнічы перформанс для дзяцей «У гасцях у Дзеда Мароза». Час наведванняў — з 11 да 21 гадзіны. Святочныя мерапрыемствы правядуць і адміністрацыі ўсіх раёнаў горада Мінска. У навагоднюю ноч галоўнай святочнай пляцоўкай стане тэрыторыя каля Палаца спорту. Канцэрт пад назвай «З Новым годам, сталіца!», у якім возьмуць удзел зоркі беларускай эстрады, будзе доўжыцца з 23 да 4 раніцы. Агні маляўнічага феерверка заззяюць над Свіслаччу ў 1.30.

**Намеснік начальніка аддзела арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання ГУСР Мінгарвыканкама Аляксандр ФРАЛОЎ** расказаў, што гандлёвыя прадпрыемствы пачалі падрыхтоўку да свят загадзя: яны ўжо закупілі больш за паўтара мільёна баулаў кандытарскіх вырабаў і 2,6 мільёна бутэлек шампанскага. Па традыцыі сярод аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання аб'яўлены конкурс на лепшае навагоднее афармленне залы. Для зручнасці пакупнікоў падоўжаны рэжым работы шматлікіх аб'ектаў: сярод іх 990 харчовых і больш за тысячу прамтаварных магазінаў, а таксама 450 кафэ і рэстаранаў.

З 15 снежня па 15 студзеня ў раёне Палаца спорту з 12 да 20 гадзін будзе праводзіцца «Калядны кірмаш», у навагоднюю ноч ён будзе доўжыцца да заканчэння святочных мерапрыемстваў. Што тычыцца продажу жывых елак, то яна будзе арганізавана з 22 па 31 снежня. Цана — ад 7 рублёў за прыгажую вышынёй адзін метр, да 23 — за яе трохметровую пушыстую сястру.

Аляксандр Фралоў таксама адзначыў, што ў перыяд правядзення навагодніх ранішнікаў і карпаратываў сталічныя аб'екты грамадскага харчавання штодня будуць прымаць да 25 тысяч наведвальнікаў. На дадзены момант больш за 75% месцаў ужо забраніравана.

**Намеснік начальніка ўпраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама Святлана ДЗЯМЕШКА** паведаміла, што з пачаткам снежня стартуе і зімовы спартыўны сезон. У сталіцы будзе заліта 48 коўзанак, 27 хакейных каробак і 16 лыжных трас, калі дазволяць умовы надвор'я. Акрамя таго, будзе арганізавана 40 пунктаў пракату інвентару і абсталявання.

У гэтым сезоне ў 10-ы раз пройдуць рэспубліканскія спаборніцтвы па хакеі з шайбай сярод аматарскіх каманд на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба і ўжо ў 13-ы раз — Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Форум, у якім прыме ўдзел 8 каманд, у тым ліку 7 замежных, адбудзецца з 4 па 7 студзеня ў «Чыжоўка-Арэне». Другі раз у рамках чэмпіянату Беларусі паміж сабой паспаборнічаюць аматары зімовага плавання. Экстрэмальны заплыў адбудзецца 17—18 снежня на Камсамольскім возеры.

У святочны перыяд чакаецца вялікі паток замежных турыстаў. У Мінску зараз дзейнічае два аўтобусныя экскурсійныя маршруты: №1 і №100. Аповед пра славутасці сталіцы вядзецца на англійскай і рускай мовах, аднак напярэдадні Новага года да іх дадасца яшчэ і беларуская.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Добры старт

# У НАС З'ЯВІЎСЯ «БРОНЗАВЫ» СНАЙПЕР

## Дар'я Юркевіч паднялася на п'едэстал першага этапу Кубка свету па біятлоне

**У індывідуальнай гонцы на 15 км у шведскім Эстэрсундзе наша спартсменка заваявала бронзавую ўзнагароду. Апярэдзіць яе змаглі толькі немка Лаура Дальмайер і француженка Анаіс Бяскон.**




Галоўным козырам Дар'і ў гэтай гонцы стала стральба. У сувязі з моцным парывістым ветрам у Эстэрсундзе многія біятланісткі ў той дзень нарабілі шмат памылак на стрэльбішчы, але беларуску такія ўмовы надвор'я не напалохалі і не перашкодзілі паказаць сябе сапраўдным прафесіяналам. Юркевіч адзіная з усіх (у гонцы ўдзельнічала 101 спартсменка) змагла абысціся без промахаў на ўсіх чатырох агнявых рубяжах, што дазволіла ёй трапіць на п'едэстал Кубка свету ўпершыню ў сваёй кар'еры.

— *Яшчэ да старту гонкі паставіла перад сабой задачу — страляць без памылак. Але на справе аказалася, што гэта вельмі цяжка, таму што моцна перашкаджаў вецер. У такой сітуацыі вырашыла не спяшацца і сканцэнтравацца на агнявых рубяжах. Асабліва гэта тычылася заключнай стральбы. Ні аб якім прызавым месцы на дыстанцыі не думала. Бронзавы медаль — гэта шчаслівы шок. Узнагарода за доўгае цярпенне. Зрабіла такі сюрпрыз і сабе, і камандзе, і балельшчыкам. Не скрыю, да галоўнага старту сезона, чэмпіянату свету, буду рыхтавацца менавіта да індывідуальнай гонкі: яна атрымліваецца ў мяне лепш за ўсё,* — расказала Дар'я пасля ўзнагароджання.

Нагадаем, да поспеху Дар'і Юркевіч у апошні раз беларускія біятланісты падымаліся на п'едэстал у гонках Кубка свету ў сакавіку 2015 года.

Адзначым, што 28-гадовая Дар'я Юркевіч дэбютавала на Кубку свету ў 2010 годзе, але доўгі час не магла замацавацца ў асноўным складзе. Аж да леташняга сезона Дар'я выступала пераважна на этапах Кубка IBU і толькі зрэдку трапляла на галоўныя старты.

Для іншых беларусак індывідуальная гонка склалася не так паспяхова. Надзея Скардзіна стала 43-й, Ірына Крыўко — 46-й, Анастасія Кінунен — 72-й, Хрысціна Ільчанка — 85-й.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Быць у трэндзе

# Вышэйшая адзнака для «Карты навучэнца»

**Інтэлектуальны прадукт Беларусбанка — «Карта навучэнца» — пераможца ў конкурсе Global Inclusion Awards 2016.**

Прэміямі Global Inclusion Awards узнагароджваюцца банкі і фінансавыя інстытуты за дасягненні ў развіцці фінансавай адукаванасці. Пад увагу бяруцца новыя падыходы да навучання дзяцей, уцягванне моладзі ў больш актыўнае ўзаемадзеянне з фінансавым сектарам. У конкурсе прынялі ўдзел праекты з 60 краін. Фіналістамі сталі прадстаўнікі Беларусі, Расіі, Вялікабрытаніі, Польшчы, Грузіі і Зімбабве. Рашэннем незалежнага міжнароднага журы «Карта навучэнца» была прызнана пераможцам у катэгорыі «Найлепшы прадукт для дзяцей і моладзі» (Child Friendly Banking Award).

Укараненне «Карты навучэнца« носіць некамерцыйны характар і скіраванае на забеспячэнне даступнасці якасных адукацыйных рэсурсаў і паслуг. Праект рэалізаваны Беларусбанкам і дзяржаўным прадпрыемствам «Цэнтр сістэм ідэнтыфікацыі». Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сумесна з зацікаўленымі ведамствамі сістэмы адукацыі. У прэс-службе банка растлумачылі: «Карта навучэнца» ўяўляе сабой бескантактны шматфункцыянальны дакумент і можа выкарыстоўвацца для аказання навучэнцам паслуг і сэрвісаў інфармацыйнымі сістэмамі ўстаноў адукацыі, горада і краіны. Напрыклад, яна можа выконваць функцыю электроннага прапуску ў школу, чытацкага білета — у бібліятэцы, ідэнтыфікатара карыстальніка — у камп'ютарным класе, праязнога дакумента — у гарадскім транспарце. Да таго ж «Карта навучэнца» сумешчана з банкаўскай карткай аплатнай сістэмы Белкарт, якая выпускаецца Беларусбанкам і з'яўляецца паўнавартасным плацежным сродкам на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# «ЗНОЎ БУДЗЕМ ШЧАСЦЕ МЕЦЬ І ВОЛЮ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Янку Купалу было наканавана лёсам стаць сведкам двух сусветных войнаў, жудасных войнаў, якія пракаціліся па тэрыторыі Беларусі, — адзначыў падчас адкрыцця выставы **дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Дзмітрый ШЛЯХЦІН**. — Паэт заўсёды быў вялікім гуманістам. А калі даведаўся, што ў гады Вялікай Айчыннай адбываецца на Радзіме, стаў змагаром за свабоду і шчасце беларускага народа. Яго зброяй было палымянае слова. Творы, напісаныя Янкам Купалам у гады Вялікай Айчыннай вайны, — маніфесты сапраўднага патрыёта.

Выстава адлюстроўвае, як Іван Дамінікавіч успрымаў вайну, як рэагаваў на падзеі, што адбываліся вакол, увогуле, як вайна паўплывала на лёс паэта. Па словах **куратара выставы Паўла КАРАЛЁВА**, яна проста памяняла жыццё класіка. «Чалавек амаль у 60-гадовым узросце быў вымушаны нанова перажыць вайну, — гаворыць куратар выставы. — Дом пісьменніка пацярпеў у час першай бамбёжкі Мінска (ён стаяў на месцы сённяшняга Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы). Паэт вельмі перажываў, аб чым сведчыць тое, што ў першы год ад'езду ён увесь час успамінаў свой дом».

Пачатак Другой сусветнай Янка Купала сустрэў у Коўна (цяперашні Каўнас), дзе знаходзіўся па рабочых справах. На трэці дзень вайны ён едзе на сваё лецішча ў Ляўкі, што пад Оршай. У гэтых мясцінах пісьменнік любіў бавіць час кожнае лета. Карціна Івана Пратасені «Развітанне ў Ляўках Купалы і Коласа», якая экспануецца на выставе, расказвае наведвальнікам аб тым, што менавіта тут у размовах і абмеркаваннях правялі ноч з 26 на 27 чэрвеня 1941 года класікі айчыннай літаратуры, пасля чаго назаўжды пакінулі Беларусь. Дарэчы, у наступным годзе будзем святкаваць 135-годдзе з дня нараджэння пісьменнікаў.

Пасля актыўнага, але невялікага перыяду творчасці ў Маскве, Янка Купала накіроўваецца ў Казань. Але да месца прызначэння ён так і не даехаў. Каб дабрацца да горада, трэба было пераадолець Волгу. Пакуль чакаў сваёй чаргі ў пасёлку Пячышчы, што недалёка ад Казані, атрымаў запрашэнне ад начальніка мясцовага мукамольнага завода.

Іван Наякшын, які добра ведаў творчасць Янкі Купалы, сагрэў паэта гарбатай і сказаў, што ў Казань лепш не ехаць, паколькі там шмат эвакуяваных, і прапанаваў пісьменніку застацца на заводзе, дзе для яго адвялі пакой. Успаміны Наякшына аб той сустрэчы прадстаўлены на выставе. Як і фотаздымак 1942 года, на якім можна ўбачыць, як выглядаў пакой класіка ў Пячышчах.

Цікава, што над ложкам Купалы вісела карта свету. На ёй пісьменнік пазначаў ход ваенных дзеянняў. Ёсць звесткі, што калі са зводак навін ён чуў аб вызваленні пэўнага горада, назва якога падавалася ў выглядзе адной літары, то адразу падбіраў да іх назвы беларускіх гарадоў. Так хацелася Купалу вярнуцца ў Беларусь, але да вызвалення Радзімы было яшчэ далёка...

У экспазіцыі — асабістыя рэчы класіка. У прыватнасці, прылада для галення, пачкі ад цыгарэт, камінчыкі для запальнічак, аскепак вазы, які знайшлі на папялішчы Купалавага дома, кіёк, які падарылі паэту ў Пячышчах (сёння ў тым пакоі, дзе ён жыў, знаходзіцца музей).

Увагу прыцягвае самавар. У той складаны час гэта была проста неабходная рэч. Захаваўся ліст, у якім у красавіку 1942 года Янка Купала звяртаецца да сваіх даўніх знаёмых, дзе просіць даслаць яму самавар.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Даслоўна: «Дашліце, калі ласка, самавар. Без яго мы проста гінем...» І каб той належна даехаў, прапаноўвае загарнуць яго ў свой касцюм.

— Янка Купала пасмяротна атрымаў медаль «За абарону Масквы», — расказвае куратар выставы. — Ён тушыў бомбы, якія запальваліся на дахах горада. У фондах музея захоўваецца расклад, па якім кожны жыхар кватэры дзяжурыў на даху. Там ёсць і прозвішча паэта.

У экспазіцыі — і рэчы пляменніцы пісьменніка Яніны Раманоўскай. Будучы на фронце палявым хірургам, яна ўратавала не адно жыццё. Янка Купала займаўся выхаваннем сваячкі і ў пэўным сэнсе замяніў ёй бацьку, якога рэпрэсавалі.

Пляменнік класіка Янка Раманоўскі быў мастаком. Ён часта пісаў свайго знакамітага дзядзьку. Некалькі яго твораў экспануюцца побач з работамі, створанымі майстрамі жывапісу. Па меркаванні экспертаў, адзін з найлепшых партрэтаў Купалы належыць пэндзлю народнага мастака СССР, Героя Беларусі Міхаіла Савіцкага.

На выставе можна ўбачыць нумары знакамітага выдання — газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», дзе падчас Вялікай Айчыннай вайны друкаваліся творы Янкі Купалы. На жаль, песняру не наканавана было прычакаць вызвалення сваёй любай Беларусі...

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

# СУВЕНІР З ЛЁСАМ


**Дырэктар Веткаўскага музея стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Г. Шклярава Галіна НЯЧАЕВА, настаўнік СШ №1 г. Калінкавічы Ніна ПЫРКО і дырэктар прыватнай установы «Тэрыторыя развіцця — XXI стагоддзе» Ірына БАГДАНЕЦ.**

## Імідж — усё

Сапраўды, гаворыць **прэс-сакратар Гомельскага аддзялення БелГПП Ірына ТАКОЕВА**, заўсёды ідзе пошук майстроў, якія могуць вырабіць спецыяльныя іміджавыя сувеніры:

— Да таго ж на працягу некалькіх гадоў падчас правядзення прамысловых выстаў мы праводзім і святы майстроў. Запрашаем рамеснікаў не толькі з усёй нашай краіны, але і з Расіі, Украіны, Казахстана для ўдзелу ў мерапрыемствах.

Звышмэту сувенірнай прадукцыі агучвае **генеральны дырэктар Гомельскага аддзялення БелГПП Марына ФІЛОНАВА**: рамесніцкі выраб абавязкова павінен асацыявацца з рэгіёнам.

— Таму нам важна не толькі разабрацца, якім можа быць іміджавы сувенір, якія матэрыялы для яго лепш выкарыстоўваць, — тлумачыць ён. — Не менш важная ўпакоўка і нават памер. Рэч пра тое, што ёсць пэўныя абмежаванні для вывазу па памерах і вазе. Напрыклад, гліняныя вырабы вельмі крохкія і іх можна не давезці ў багажы цэлымі.

Дарэчы, і **дацэнт кафедры паліталогіі і сацыялогіі ГДУ імя Ф. Скарыны Анатоль КАСЬЯНЕНКА** лічыць, што ў краіне можа быць некалькі рэгіянальных брэндаў, якія падкрэсліваюць асаблівасці кожнага канкрэтнага раёна.

— Вопыт іншых краін трэба мець на ўвазе. У Славакіі, напрыклад, ёсць некалькі рэгіянальных брэндаў, якія замацаваны гандлёвай маркай і павінны несці на сабе прыкметы пэўнай тэрыторыі. Пры гэтым звычайна імкнуцца захаваць яе гістарычную назву. Тавары звязаны з мясцовымі традыцыямі, культурай, матэрыяламі... Часткай маркетынгавай палітыкі з'яўляюцца іміджавыя мерапрыемствы па прасоўванні тэрыторый. І сувеніры ў гэтым могуць добра дапамагчы. Дарэчы, летась Беларусь наведала каля 300 тысяч арганізаваных турыстаў. Яны з задавальненнем купілі б нашу сувенірную прадукцыю, але ў нашых адпаведных крамах абсалютная большасць тавараў прывезена з Расіі і з ёй напрамую асацыюецца, як, напрыклад, кветкавыя роспісы пад «гжэль» ці «жостава».

## Неадназначная Неглюбка

Тэкстыльныя традыцыі аддаленай вёскі Неглюбка Веткаўскага раёна сёлета прызнаны ўнікальнай з'явай беларускай народнай творчасці і папоўнілі Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Такім чынам, бела-чырвоныя ручнікі з Неглюбкі з'яўляюцца візітнай карткай Беларусі і вельмі часта выкарыстоўваюцца для падарункаў. Вырабы ўтрымліваюць дзясяткі складаных арнаментаў — таямнічых знакаў нашых продкаў. І менавіта гэта дае падставу пераводзіць іх на сучасную мову стэрэатыпаў, — заўважае **дырэктар Веткаўскага музея стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Г. Шклярава Галіна НЯЧАЕВА**:

— На жаль, сёння легенда для сувеніра працуе аднапланава. Маладыя людзі маюць цікавасць да сваёй культуры, але яны хочуць ад яе нейкай адназначнасці. І часта задаюць пытанні: а які знак добры? А які — дрэнны? Я адказваю: кожны знак сімвалічны. Ён касмалагічны, таму добры. Мне хацелася б перасцерагчы некаторых ад прымітыўнасці мыслення. Нашы традыцыі архетыпічныя, яны пластычныя і глыбокія. Таму не можа быць адназначнай трактоўкі знакаў. Пішуць на нейкім вырабе: «знак ураджаю». А гэта яшчэ і знак нараджэння, і знак поспеху...

Між тым, нагадвае Галіна Рыгораўна, арнаментальныя знакі на тканіну калісьці трапілі з керамікі. А чаму б сёння гэты працэс не накіраваць у адваротны бок?

— Знак спачатку выдрапваўся на вільготнай гліне пасудзіны, якая потым апальвалася. Чаму б сёння нам не рабіць «археалагічныя» чыгункі, падобныя на тыя, якія калісьці выраблялся тут?

## Ідэі-выкапні

Археалогія ўвогуле дае шмат вобразаў, якія можна выкарыстоўваць у сучасных сувенірах. На рубяжы эпохі хрысціянства на нашай тэрыторыі выраблялся прыгожыя «глазчатые» сінія каралі. Кіеўская культура V стагоддзя, распаўсюджаная на гэтых тэрыторыях, дае прыклады цікавых рэчаў з бронзы і латуні. У Юравічах Калінкавіцкага раёна знаходзіцца буйнейшы помнік эпохі палеаліту. Там знойдзены магільнік і стаянка першабытнага чалавека, узрост якой больш за 26 тысяч гадоў. У Юравічах былі знойдзены ў тым ліку косткі мамантаў, на якіх палявалі нашы далёкія продкі. Таму, прапануе кіраўнік Веткаўскага музея, і выява маманта, а не толькі зубра, магла б стаць адным з сімвалаў нашай краіны:

— Прафесійныя мастакі могуць даць сучасную транскрыпцыю любога архетыпічнага вобраза. Такім чынам будзе адбывацца інфармацыйны дыялог традыцыі і будучыні. Чаму мы спыняемся на трох варыянтах сувеніраў? У Гомельскай вобласці было не менш за 16—18 строяў адзення. Чаму б гэта не выкарыстоўваць у кожным з раёнаў? Наш рэгіён славіўся вытворчасцю пернікаў і абаранкаў. Чаму б іх не рабіць сёння? На парцэляне можна намаляваць і нашы любімыя арнаменты, і выявы літар са старажытных кніг, якія захоўваюцца ў нашым музеі.

І гэта далёка не ўсе з агучаных за круглым сталом ідэй і легенд для сувеніраў з сэнсам. Дарэчы, нагадвае **дырэктар прыватнай установы «Тэрыторыя развіцця — XXI стагоддзе» Ірына БАГДАНЕЦ**, трэба не забыць пра пакупнікоў-калекцыянераў:

— Ёсць людзі, якія па ўсім свеце збіраюць напарсткі, званочкі, лыжачкі, кубкі, цацкі, талеркі, кацянят, выкананых у рознай тэхніцы. А калі тое самае кацяня будзе апранута ў кашулю з нацыянальным беларускім каларытам, на яго абавязкова знойдзецца ўдзячны захоплены пакупнік.

## Рамеснік палохае гандляра

**Керамісты з Гомеля, муж і жонка Яўген ПЯТРОЎ і Ірына ГАЎРЫЛЕНКА**, агучылі свой погляд на сучасныя праблемы рамеснікаў:

— Прыватныя крамы імкнуцца зрабіць надбаўку ў 100 % да цаны, якую мы прапануем для продажу. Для спажыўца гэта занадта дорага. А дзяржаўныя крамы з рамеснікамі ўвогуле не хочуць мець справу. Калі гаворыш, што ты рамеснік, усе палохаюцца. Кажуць: мы з рамеснікамі не працуем. Нас пытаюць: а як з вамі дагавор заключыць, вы ж не працуеце з накладнымі? Да таго ж, састойна рэалізоўваць прадукцыю складана. Такога Арбата, як у сталіцы Расіі, у нас няма. Нам здаецца, павінна быць вызначанае месца, дзе гандлююць не перакупшчыкі, а самі вытворцы мастацкіх вырабаў.

— Вельмі хацелася б, каб сувенір урэшце прыводзіў нашых гасцей, у тым ліку заможных, у канкрэтны раён, — дзеліцца сваімі марамі Марына Філонава. — Мы будзем падтрымліваць унікальныя традыцыі нашых раёнаў. А пакуль што пераканаліся, што важна стварэнне дэманстрацыйнай пляцоўкі для рамеснікаў. Патрэбна дапамагчы ім прасоўваць прадукцыю і такім чынам прэзентаваць сябе. Мы хачам сабраць базу сувеніраў Гомельшчыны, каб дэманстраваць іх на сваіх выставах.

## Праблемная самазанятасць

**Першы намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Аляксандр НАХАЕНКА** гаворыць пра важнасць фарміравання сістэмнай работы ў «сувенірным кірунку»:

— Калі мы гаворым пра падтрымку народнай творчасці, я вылучыў бы выраб традыцыйных рэчаў, якія маюць прыкладное значэнне, і непасрэдна сувенірнай прадукцыі. Усё гэта сапраўды можа дапамагаць вырашаць праблему самазанятасці насельніцтва, асабліва ў рэгіёнах. Дарэчы, трэба ўлічваць і тое, што стварэнне аднаго рабочага месца ў сферы народных промыслаў каштуе на парадак менш, чым у сферы высокіх тэхналогій. Гандлёва-прамысловая палата — не сацыяльны інстытут, мы накіраваны на падтрымку і развіццё бізнесу. Сёння мы дапамагаем рамеснікам, заўтра яны дапамагаюць нам. Мы да многіх пытанняў, якія тычацца дзейнасці рамеснікаў, толькі падыходзім, таму тэму трэба абавязкова развіваць. У нас вельмі многа заканадаўчай цяганіны, якая перашкаджае рамеснікам займацца сваёй справай. Шмат пытанняў, якія тычацца рэалізацыі іх прадукцыі. Між тым, праблемы якаснай сувенірнай прадукцыі стаяць у комплексе з іншымі, якія тычацца прыцягнення ў Беларусь турыстаў.

## Здзіўляй і перамагай

Тым разам дадзены старт першаму адкрытаму конкурсу «Гомельскі сувенір», які на справе будзе садзейнічаць выяўленню майстроў-вытворцаў крэатыўнай прадукцыі з элементамі сімволікі, брэндавых знакаў, мясцовых славутасцяў, а таксама актывізаваць удзел рамеснікаў у выставах і кірмашах. **Намеснік генеральнага дырэктара Гомельскага аддзялення БелГПП Барыс ГУШЧЫН** гаворыць, што да 25 лютага 2017 года будзе ажыццяўляцца прыём сувеніраў ад рамеснікаў і майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці:

— Конкурс пройдзе ў некалькіх намінацыях: сувенір прадстаўніцкага класа, рэгіянальны сувенір, этнаграфічны і калекцыйны. Будуць ацэньвацца арыгінальнасць і якасць выканання, высокі мастацкі ўзровень, наяўнасць пакавання і даступны для масавага спажыўца кошт. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў запланавана на канец сакавіка. Да гэтага ў Гомельскай вобласці пройдзе шэсць універсальных выстаў, на якіх рамеснікі і майстры дэкаратыўна-прыкладной творчасці змогуць прадэманстраваць свае экспазіцыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Тамара ВЯЦКАЯ:

# «У ЭФІРЫ ЎСЁ МУСІЦЬ БЫЦЬ БЕЛАРУСКІМ»

**У яе кабінеце — анёлы самых розных формаў, памераў і спосабаў вырабу. А яшчэ — маленькі прынц ручной работы, які сядзіць на адзінокай планеце са сваёй ружаю. Сярод настольных гадаванцаў ёсць і жырафа. «Яна як любоў, — кажа Тамара Вяцкая, дырэктар радыёстанцыі «Мінская хваля». — Гэта жывёла, якая па ўсіх законах фізіялогіі не можа існаваць. Так і каханне. Па логіцы яго быць не можа. Але яно прыходзіць незразумела чаму, дзеля чаго, да каго і заўжды знянацку...» Тамара Вяцкая ўзначальвае «Мінскую хвалю» ўжо другі год. За гэты час радыёстанцыя нібы атрымала другое дыханне: стала больш актыўна праяўляць сябе ў сацыяльных сетках, здымаць відэа, рабіць кантэнт максімальна інфармацыйна насычаным. Як кажуць, усе працэсы ў рыбе пачынаюцца з галавы, і не толькі дрэнныя, але і жыццядзейныя...**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Я цяпер пра «Мінскую хвалю» магу гаварыць гадзінамі, — дзеліцца дырэктар. — Таму што столькі зроблена! Другі год працую, а адчуванне, што значна даўжэй. Напрыклад, за гэты час аднавілася праграма «Адкрытая студыя», да нас на станцыю госці прыходзяць кожны аўторак. Гутарым на самыя розныя тэмы, імкнёмся спалучаць іх з апошнімі падзеямі і навінамі. Прытым не абмяжоўваемся адным гукам, а выкладаем у сацыяльныя сеткі фатаграфіі з нашымі героямі, здымаем відэа, якое пасля размяшчаем на сайце. Такім чынам набліжаемся да паняцця тэлерадыёвяшчання, каб быць канкурэнтаздольнымі. Па-іншаму цяпер немагчыма.

У нас працуе 31 чалавек. Гэта досыць шмат для станцыі. З некаторых работнікаў шасцёра ў інтэрнэт-аддзеле, які займаецца не толькі радыёвяшчаннем, але і хостынгам, вядзеннем дзвюх соцень сайтаў. У рэкламе — чацвёра. Амаль што ўсе астатнія рыхтуюць перадачы, сюжэты, вядуць эфір.

***— Ваша старонка ў Фэйсбуку адразу «выдае» нераўнадушнае стаўленне да працы...***

— Няўжо ёсць журналісты, абыякавыя да таго, што робяць? Гэта ўжо не журналісты. Павінны гарэць сэрца, душа, мозг — усё! Як не любіць тое, што робіш? Як жыць з нелюбімым мужчынам? Я не магу ні жыць з нялюбым, ні не любіць тое, што раблю. Бо Бог ёсць любоў. Калі не любіш — не рабі. А раз узяўся — пранікайся і стварай годнае!

**«Людзі павінны ведаць, што Беларусь — гэта не чарка, скварка ды бульба. Гэта ў добрым сэнсе шалёныя галовы — беларусы!»**

***— Вы ўвогуле досыць актыўна карыстаецеся сацыяльнымі сеткамі. Якія каментарыі вам пакідаюць?***

— Выключна станоўчыя. Дагэтуль шчыра здзіўляюся, калі ў каго-небудзь хапае духу і сіл пакінуць пад маім пастом у Фэйсбуку адмоўны водгук. Хоць з адным маім аднакурснікам перапіска-перапалка здараецца. Але гэта ў большай ступені рыса яго характару. Усе яго колкасці пераводжу на смех і ў прыватных паведамленнях пішу «Хопіць мяне падколваць!» Увогуле не люблю негатыў нідзе. Калі чалавек мне не падабаецца, я наўпрост перастаю з ім размаўляць. Гэта разуменне прыйшло з узростам. Калі малады — ідзеш напралом. А часам і не варта гэтага рабіць.

***— Наколькі вы дэмакратычны кіраўнік?***

— Я ўсё вырашаю камісійна. Напрыклад, кажу свайму праграмнаму дырэктару: «У нас пачатак вяшчання a 6-й раніцы. Давай мы зробім гімн. Ёсць ён і ў Мінскай вобласці. Возьмем адтуль частку». Але той варыянт, які атрымліваецца адшукаць, не падыходзіць, бо спяваюць музыкі занадта акадэмічна. Тады пішу аўтару гэтай песні, Алене Атрашкевіч, запытваю, ці ёсць больш лёгкае выкананне. Яна ў адказ перакідвае некалькі варыянтаў. Мы выразаем адзін куплет, але тое, што атрымліваем у выніку, мне не падабаецца, праграмнаму дырэктару — наадварот. У такім выпадку вырашаем камісіяй. Збіраем у адным кабінеце музычнага рэдактара, другога намесніка дырэктара. Меркаванні дзеляцца напалам. Тады апошняе слова застаецца за мной як за непасрэдным кіраўніком. Гэта дэмакратыя ці не?

Я падыходжу да работы з таго пункту гледжання, што ўсе мы людзі часовыя на сваіх працоўных месцах. У мяне няма ніякага маральнага права абражаць ці асуджаць іншых. Я не стварала гэта радыё. Але ёсць рэчы, у якіх я радыкальная і кажу жорстка «так» ці «не». Напрыклад, з маім прыходам усе тэксты аўтарскіх перадач сталі аддавацца на вычытку. Бо не ўсё, што пішуць нашы журналісты, я лічу слушным. Пры гэтым я не кірую іх творчым працэсам. Магу толькі ацаніць абранага героя, падыход ці паправіць канчатковы тэкст.

***— І як яго ацэньваеце? Увогуле, як лічыце, чым вымяраецца журналісцкае майстэрства?***

— Трэба глядзець, што мы маем на выхадзе — канчатковы прадукт. Прафесіяналізм — гэта калі цябе хочацца слухаць і чытаць. Гэта пункт нумар адзін. Астатняе — справа тэхнікі. Няхай дзесьці кажаш няправільна ці не ведаеш правілаў жанру, але калі цікава слухаць, усё астатняе можна дараваць.

***— Але гэта складана вымераць...***

— Тады дапамагае інтэрактыўнасць. У нашым выпадку — гэта тая ж колькасць sms, якія прыйшлі падчас эфіру. Калі іх з дзясятак — дастойны паказчык. Пяць — усе кажуць, каб я не перажывала. Усё адно застаюся незадаволенай. Значыць, я не выклікала ў чалавека жадання падзяліцца сваімі думкамі. Каб хоць бы мне перадалі прывітанне ці напісалі: «Тамара Рыгораўна, пастаўце для сябе, любай, песню, няхай вам будзе прыемна».

Ці калі пасля тваіго матэрыялу з работы каго-небудзь знялі. Таксама паказчык прафесіяналізму. У мяне так было па маладосці. Па адной з маіх перадач склікалі пасяджэнне Саўміна. Тады я была гарачая, шашкай махала. А пасля зразумела, што не гэта задача журналіста.

**БЛІЦ-АПЫТАННЕ**

**— Дзень ці ноч?**
— Ноч.
**— Дождж ці сонца?**
— Сонца. А лепш вясёлка!
**— Горы ці мора?**
— Мора.
**— Адпачынак ці праца?**
— Праца.
**— Дзеці ці сябры?**
— Дзеці.
**— Розум ці сэрца?**
— Сэрца.
**— Аддаць ці ўзяць?**
— Аддаць.
**— Маўчанне ці слова?**
— Слова.
**— Зямля ці неба?**
— Зямля.
**— Боль ці абязбольваючае?**
— Боль.
**— Страх ці страсць?**
— Страх.
**— Дарога ў храм ці дадому?**
— Дадому.

**«Калісьці абрала для сябе Беларусь мэтанакіравана — з-за «Песняроў». Села на цягнік і з'ехала, бо для мяне гэта была «іх» краіна, поўная песень з пякучай энергетыкай».**

***— У чым яна ў такім выпадку?***

— Сродкі масавай інфармацыі — гэта люстэрка. Часам крывое, часам — венецыянскае. Ведаеце, у чым сакрэт апошняга? Яго згубілі. Такіх люстэркаў больш няма. Каб яго правярыць, бярэцца люстэрка, падпальваецца запалка і падносіцца. Калі адбітак агеньчыка ў ім шматразова адлюстроўваецца, сыходзячы ў бясконцасць, — тады яно сапраўднае. Кожны журналіст сам абірае, якім люстэркам будзе.

Для мяне найвышэйшая задача журналістыкі — гэта даць як мага больш гонару чалавеку за месца, дзе ён жыве, як мага больш ведаў. Не толькі ў беларускім эфіры, а і ў свеце ў прынцыпе вельмі мала адукацыйных тэлеканалаў, радыёстанцый. Таму я хачу «Мінскую хвалю» насыціць як мага большай колькасцю інфармацыі рознага плана. Дарэчы, у нас спачатку «Каляндар гісторыі» быў «адвязаны». Цяпер мы яго наблізілі да Беларусі, каб чалавек пра тое месца, дзе жыве, як мінімум чуў.

Бо Беларусь — гэта настолькі закрытая зямля! Тут так шмат цікавага, а мы нават не ўсведамляем гэтага. Чаму? Бо нам ніхто пра гэта не сказаў. Такое не можа прыйсці як паветра ў галаву. А хто мусіць настроіць на падобную думку? Мы, журналісты. А для гэтага нам патрэбна бясконцая дапытлівасць. Пра Беларусь я ведаю шмат, бо, калі працавала у Тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі Саюзнай дзяржавы, мы зрабілі 42 праграмы «Траса М-1» (вандравалі па мястэчках і вёсках, якія можна напаткаць недалёка ад гэтай дарогі), з якіх Расіі было прысвечана толькі дзесяць. Рэдактар пастаянна адшукваў факты, якіх з паверхні не возьмеш. Я паехала, паглядзела на беларускія вёскі, і расказала пасля тысячам гледачоў. Выканала задачу: адкрыла тое месца, дзе мы жывём.

На радыё існуе прапорцыя — 75% айчыннай музыкі і 25% — іншай. А мусіць быць усе 95% сваёй! Бо яе шмат. І яшчэ больш, чым мы думаем, якасней. Нашто нам англамоўная музыка ў такіх вялікіх памерах? Каб з маладога пакалення гадаваць касмапалітаў? Ці ўсё ж такі патрыётаў? Гэта як псаваць свой жа калодзеж...

***— Тамара Рыгораўна, вы не беларуска, а так яскрава кажаце пра любоў да краіны...***

— Я абавязана любіць гэту краіну. Калісьці абрала для сябе Беларусь мэтанакіравана — з-за «Песняроў». Села на цягнік і з'ехала, бо для мяне гэта была «іх» краіна, поўная песень з пякучай энергетыкай. І ні на секунду не пашкадавала аб сваім рашэнні. Калі мяне адправілі працаваць у Маскву, я першы год плакала штовечар. Мае дзеці — ніхто! — не збіраецца пераязджаць жыць за мяжу. Адна з маіх дачок скончыла Літаратурны інстытут у Маскве і ўсё адно вярнулася ў Мінск.

Беларусь — бясконцая. Была нядаўна ў вёсцы Міханавічы Мінскага раёна, а там выступаў гурт «Калыханка». Зусім дзеці, у народных строях, а якія галасы, як пастаўлены! Аўтэнтычныя што ні на ёсць. Ці нядаўна прывезлі нас ва Узду. Вёска ў 30 хат. Заводзяць у Палац культуры. Гляджу і пытаюся: што ў вас на сцяне? «А гэта маляванка». Я першы раз у жыцці бачыла маляваны дыванок. А яму гадоў сто, а фарба не аблупліваецца. У гэтым уся Беларусь! Людзі павінны ведаць, што Беларусь — гэта не чарка, скварка ды бульба. Гэта ў добрым сэнсе шалёныя галовы — беларусы!

***— Мы з вамі так шмат кажам аб працы... А як адпачываеце?***

— У мяне ёсць хатка ў вёсцы Дукора на Пухавіччыне Мінскай вобласці. Колькі гадоў таму набыла сабе яе, яшчэ калі працавала ў Маскве. Прыехала, пабачыла і палюбіла з першага погляду. Гэта маё любімае месца, куды збягаю далей ад горада. Па суботах працую ў першай палове дня — вяду канцэрты-віншаванні на «Мінскай хвалі», а пасля сядаю на маршрутку — і пачынаецца сапраўдны адпачынак. Распальваю печ, раблю адтопленае малако, пяку хлеб, іду па грыбы. Бывае, збяруся, а вясковыя жанчыны, калі бачаць, што ў лес накіравалася, кажуць: «Куды ідзеш? Няма грыбоў больш». Я прыходжу назад праз пару гадзін з поўным вядром... Пасля чышчу, гатую. Варэнне вару, бо слівы ёсць. А яшчэ на мне бульба і памідоры, ружы... Усё paзнаецца ў параўнанні. Не надта і завіхаюся ў Дукоры, я ўсё ж гарадская, але гэта для мяне — суткі ў маім персанальным раі, таму што там я шмат гляджу, шмат думаю, шмат адчуваю... Жыву!

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Тэлесеткі

# УДАРЫМ ПА РЭАЛІЦІ



**Адна з галоўных адметнасцяў маладзёжнага тэлеканала «Беларусь 2» у новым сезоне — вялікая колькасць рэаліці-шоу ў эфіры. Чарговыя навінкі, прычым абедзве ўкраінскай вытворчасці, прапануюцца ўвазе беларускіх гледачоў ужо з гэтай суботы, 3 снежня.**

Праект «Вяселле ўсляпую», напэўна, спадабаецца рамантыкам, якія вераць у перамогу сапраўднага кахання над жыццёвымі абставінамі. Аўтары рэаліці-шоу праводзяць унікальны сацыяльны эксперымент. Яго ўдзельнікі незнаёмыя адзін з адным, але аб'яднаныя няўдалым вопытам у сямейных стасунках. Кожны з іх рызыкнуў узяць удзел у кастынгу тэлепраекта, бо самастойна так і не здолеў пасля колішняга балючага разрыву з партнёрам уладкаваць сваё асабістае жыццё. У рэаліці-шоу пары, якія пазнаёміцца толькі пасля роспісу, паспрабуюць стварыць новую моцную сям'ю — але ўжо з дапамогай і падказкамі экспертаў, сярод якіх псіхолаг, «love-коўч» і астролаг. Кожнай пары трэба будзе прайсці спецыялізаваныя тэсты на псіхалагічную, эмацыянальную, астралагічную і сексуальную сумяшчальнасць, а таксама праверку на стрэсаўстойлівасць — у выніку яны атрымаюць ад экспертаў прагноз на трываласць стасункаў і парады, як пазбегнуць асабліва небяспечных памылак. Карацей, шанц на ўладкаванне сямейнага агменю атрымае кожны з удзельнікаў — а вось ці многа з «акальцаваных усляпую» сямейных пар застануцца разам і пасля заканчэння тэлевізійнага квеста, стане вядома толькі напрыканцы праекта.

Медыцынскае рэаліці-шоу «Вярніце мне прыгажосць», разлічанае на шырокую аўдыторыю, пакажа вонкавыя і ўнутраныя пераўтварэнні людзей, якім іх цяперашняя недасканаласць прынесла шмат горкіх перажыванняў, болі і слёз — а некаторым наўпрост зламала жыццё. Героі, дакладней, гераіні гэтага тэлепраекта — жанчыны, якія не проста камплексуюць з-за ўласнай знешнасці, але ўжо шмат гадоў фізічна і псіхалагічна пакутуюць з-за складаных дыягназаў, генетычных праблем або цяжкіх хвароб... Адмысловая «Каманда выратавання», у якую ўвайшлі вядомыя эстэтычныя, рэканструкцыйныя і пластычныя хірургі, вопытны псіхатэрапеўт і стыліст-іміджмейкер, з імпэтам возьмецца нават за самыя няпростыя выпадкі і дапаможа ўдзельніцам медыцынскага рэаліці не толькі выправіць іх вонкавыя недахопы і вярнуць страчаную некалі прыгажосць, але і змяніцца ўнутрана, паверыць ва ўласныя сілы — і літаральна пачаць жыццё з чыстага ліста.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

## Аўторак, 6 снежня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.10, 22.05 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Пірат і піратка».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.05** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.45** Дзень спорту.
**0.55 Серыял «Пастка».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.55** Тэлебарометр.
**9.05, 22.05** «Анлайн 2.0». Скетчкам.
**9.35, 18.05 Дэтэктыў «Такая работа».**
**10.30, 20.05** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**11.30, 21.15 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**12.05, 17.00 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.00, 19.00** «Ікона стылю». Fashion-шоу.
**14.10** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05 Дэтэктыў «Трынаццаць».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. «Бенфіка» — «Напалі».
**0.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. Агляд.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.35** «Беларуская кухня». Зацірка і наліснікі з мачанкем.
**8.05, 11.50, 20.25** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.10 «Пастка». Драма.**
**9.05, 15.25 «Цішыня». Драма. Фільм другі.**
**11.25** «Святло далёкай зоркі». Памяці сведкі трагедыі вёскі Дальва Мікалая Гірыловіча.
**12.05** «Музеі Беларусі». Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа.
**13.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.30, 21.05** «Апладысменты, апладысменты...» Мюзікл.
**14.45** «Адваротны бок Месяца». Дак. фільм.
**17.45, 22.20** «Дыя@блог». Пра вечнае.
**19.00** «Размаўляем па-беларуску».
**19.05** «Справы фамільныя». «Няхай будзе святло». Пра гісторыю беларускіх электрастанцый.
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Эпоха Максіма Багдановіча». Фільм першы.
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**7.45** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**8.25** Час футбола.
**9.05** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Юнацтва-Мінск».
**11.00** Гандбол. Кваліфікацыя да ЧС-2017. Жанчыны. Беларусь — Швейцарыя.
**12.30** Гандбол. Кваліфікацыя да ЧС-2017. Жанчыны. Косава — Беларусь.
**14.00** Біятлон. Этап Кубка свету. Эстэрсунд. Спрынт. Мужчыны.
**15.30** Біятлон. Этап Кубка свету. Эстэрсунд. Гонка пераследу. Мужчыны.
**16.20** Біятлон. Этап Кубка свету. Эстэрсунд. Спрынт. Жанчыны.
**17.50** Біятлон. Этап Кубка свету. Эстэрсунд. Гонка пераследу. Жанчыны.
**18.45** Авертайм.
**19.15, 22.20** PRO спорт. Навіны.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Слован» (Браціслава).
**21.45** Спорт-кадр.
**22.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. Анлайн гульнявога дня.
**0.35** Плаванне. Чэмпіянат свету на кароткай вадзе.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Бесталковыя нататкі».
**19.00** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Адваротны бок Месяца».**
**22.55** «25 гадоў пасля СССР».
**23.45** «Вячэрні Ургант».
**0.20** «Давай пажэнімся!»
**1.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Драма «Смерць Супермена».**
**15.55 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**21.55** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**0.20 Маст. фільм «Дзяржаўны злачынец».**
**1.55** Дакументальны праект: «Вайна без правілаў».

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Маст. фільм «Завяшчанне прафесара Доўэля».**
**10.40 Маст. фільм «Старэйшая жонка».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Разведчыцы».**
**16.10** Ток-шоу «Слова за словам».
**17.05 Серыял «Дзявочае паляванне».**
**22.10 Маст. фільм «Арфа для каханай».**
**23.45 Маст. фільм «Усё ў жыцці бывае».**
**3.05** «Іншы свет».
**3.35 Серыял «Невідзімкі».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.15** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.35** «Наша справа».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Пятая група крыві».**
**19.10, 20.40 Серыял «Па гарачых слядах».**
**21.45, 23.10 Серыял «Тайны следства 15».**
**23.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**0.00** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**7.25** «Студыя Юліі Высоцкай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Сышчыкі».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Апякун».**
**23.05** «НЗ.BY».
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Марскія д'ябалы».**

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Трылер «Смерч».**
**13.00 Серыял «Дзеці Арбата».**
**13.50** Дак. серыял «Дыялог з усім светам».
**14.20 Камедыя «Сын маскі».**
**15.55, 19.20, 21.00, 23.55** «Надзор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.20** «Урокі дабрыні».
**16.30** Дак. серыял «Дзікая прырода Расіі».
**17.20 Серыял «Ваўкі».**
**18.15 Серыял «Правіца Божая».**
**19.25 Серыял «Агент Картэр».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Трылер «Хаос».**
**23.10 Серыял «Ганібал».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Машкіны страшылкі».
**8.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонины».
**9.40** Меладрама «Вулічныя танцы 2».
**11.40, 14.40, 19.10** Серыял «Атэль Элеон».
**12.50** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00** Серыял «Дах свету».
**15.50, 20.20** Серыял «Вечны водпуск».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**21.30** Камедыя «Няўдачлівыя».
**23.30, 5.00** Серыял «Тут нехта ёсць...»
**0.30** Серыял «Бязмоўны сведка».
**2.30, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**3.00** «Дурні і дарогі».
**3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**4.00** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 23.50** «Каломба». Серыял.
**12.50, 16.30** Сусветныя скарбы.
**13.05** «Пятае вымярэнне».
**13.30** «Багач, бядняк...» Серыял. 1-я серыя.
**14.50** Колер часу. Мікалай Ге.
**15.10** «Кінескоп». Турынскі кінафестываль.
**15.50** «Медзем». Дак. фільм.
**16.45** Да 70-годдзя Хасэ Карэраса. Гала-канцэрт у Каралеўскім тэатры «Друры-Лейн».
**18.15** «Эрмітаж».
**18.45** «Добрай ночы, малыя!»
**19.10** Урачыстае закрыццё XVII Міжнароднага тэлевізійнага конкурсу юных музыкаў «Шчаўкунок».
**21.20** Да юбілею Галіны Баласовай. «Касмічны архітэктар». Дак. фільм.
**22.00** «Хто мы?» «Прыгоды лібералізму ў Расіі».
**22.35** Ступені цывілізацыі. «Карл Вялікі». Дак. фільм. 1-я серыя.
**23.45** Мастсавет.
**1.25** С. Сланімскі. Сюіта з музыкі балета «Чароўны арэх».

### Настальгія

**6.00** Праграма «Стыль». 1992 год.
**6.40, 6.55, 11.15, 15.40, 17.00, 18.50, 20.35, 21.40, 23.00, 1.10, 2.35** Музычная настальгія.
**6.50** «Прэс-экспрэс».
**7.10** «Праграма А». 1989 год.
**9.00** Маст. фільм «Бедная Маша».
**12.00** «СеўАлогія» з Севам Наўгародцавым. «Ісус Хрыстос — суперзорка». 2004 год.
**13.05** Фільм-канцэрт «Адліга». Юрый Шаўчук і гурт «ДДТ». 1988 год.
**14.05** Тэлеспектакль «Котка на радыятары». 1977 год.
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**17.10** «Тэатральны раман» з Эдвардам Радзінскім. Маскоўскія тэатры ў 60-я гады...
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітко\ўскім: «Багаборніцтва па-савецку». 2006 год.
**19.10** Дак. фільм «Вельмі вас усіх люблю».
**23.10** «Тэатральны раман» з Эдвардам Радзінскім. Маскоўскія тэатры ў 70-я гады...
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1982. 2-я частка. 2011 год.
**1.05** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!» 1982 год.
**1.30** «Вясёлыя рэбята». «Пра густы не спрачаюцца». 1982 год.
**3.00** «Быў час». 2008 год.
**3.55** Маст. фільм «Прыгажунмужчына».

### EuroSport 1

**3.00, 8.30, 16.15** Біятлон. Кубак свету.
**3.30, 5.00, 10.15, 12.30, 17.45** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**6.30, 11.15, 15.00, 18.45** Снукер. UK Championship. Фінал.
**7.30** Зімовыя віды спорту.
**9.30, 16.45, 20.00** Горныя лыжы. Кубак свету.
**14.00** Watts.
**21.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**21.30** Веласпорт. Revolution Series.
**22.30** Веласпорт (трэк). Шэсцьдзён Амстэрдама.
**1.00** «Дух парусната спорту».
**1.30** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**2.30** Ралі ERC.

### Кінакамедыя

**0.35** Прыгоды «Ягуар».
**2.25** Прыгоды «Дачка Д'Артаньяна».
**4.40, 14.00, 14.55, 15.35, 17.45** Скетчкам «Паміж намі».
**5.35** Камедыя «Як скрасці брыльянт».
**7.20** Камедыя «Машына часу ў джакузі».
**9.05** Камедыя «Адной левай».
**10.35** Камедыя «Старыя-разбойнікі».
**12.10** Камедыя «Модная штучка».
**14.15, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Меладрама «Як выйсці замуж за мільянера», 3-я серыя.
**16.45** Меладрама «Як выйсці замуж за мільянера», 4-я серыя.
**18.00** Камедыя «М + Ж».
**19.30** Камедыя «Рымскія спатканні».
**21.10** Камедыя «Дзіўныя сваякі».
**22.45** Меладрама «Сіроп».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.30, 14.45** «Ёсць адзін сакрэт».
**7.55** «Доктар І...»
**8.25, 18.45, 2.35** «Асколкі». Серыял.
**10.00, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.40** «Сляпая».
**12.40** «Варажбітка».
**13.45** «Паралельны свет».
**15.15** «Здзелка».
**15.45** «Натуральны адбор».
**16.45, 21.30** «Рэвізора».
**17.50** «Тайны следства». Серыял.
**20.35, 1.45** «Жанна, пажані».
**22.35** «Вялікія пачуцці».
**23.10** «Звышнатуральнае». Серыял.
**23.55** «Паляўнічы на галовы». Баявік.
**4.05** «Нераскрытыя тайны».

### ТБ1000

**6.10, 17.50** Фантастыка «Дывергент».
**8.30** Меладрама «Тры метры над узроўнем неба».
**10.35** Трылер «Лофт».
**12.20** Драма «Настаўнік на замену».
**14.00** Камедыя «Шэф Адам Джонс».
**15.45** Драма «Жнівень».
**20.10** Драма «Манглхорн».
**22.10** Камедыя «Прадзюсары».
**0.30** Меладрама «Дом каля возера».
**2.30** Трылер «11:14».
**4.30** Меладрама «Кіт».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Драма «Выратаванне».
**8.00** Камедыя «Мама дарагая!»
**9.35** Трылер «Швейцар».
**11.05, 4.55** Драма «Палонны».
**12.35** Камедыя «Дэжа вю».
**14.35** Камедыя «Ключ ад спальні».
**17.10** Камедыя «Зімы не будзе».
**18.45** Драма «Кампенсацыя».
**20.20** Драма «Чэмпіёны: Хутчэй. Вышэй. Мацней».
**22.20** Баявік «З Дона выдачы няма».
**0.10** Камедыя «Ушчэнт».
**1.50** Камедыя «Практыкаванні ў прыгожым».
**3.25** Меладрама «Здзіві мяне».

### National Geographic

**6.00** Гульні розуму.
**6.25, 13.10, 21.00, 0.50, 3.55** Навуковыя недарэчнасці.
**8.30, 14.40** Шырокі погляд.
**9.15, 17.00** Антарктыка.
**10.00, 17.50** Гады небяспечнага жыцця.
**10.55** Шаша праз пекла.
**11.40, 15.25** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**12.25, 20.15** Навука будучыні.
**16.15, 19.25, 23.15, 3.10** Расследаванні авіякатастроф.
**18.40, 2.20** Ізумруд за 400 мільёнаў долараў.
**22.30** Білі Кід: новыя доказы.
**0.00** Паранармальнае.

### Discovery

**8.00, 14.00** Аляска: сям'я з лесу.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Бітвы за кантэйнеры.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.
**11.00** Хуткія і гучныя.
**12.00** Свяшчэнная сталь.
**13.00** Тэхнагеніка.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Фабрыка ўнікальных аўто.
**0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**1.00, 4.40** Самагоншчыкі.
**2.00, 6.20** Дылетант супраць эксперта.



## Кмет хоць куды

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Калама́р** (устарэлае) — чарніліца.

**Кме́т** (устарэлае) — дружыннік у Старажытнай Русі. Сёння скажуць проста воін.

**Рыцы́на** — алей, які здабываецца з насення клешчавіны. Слова прыйшло з польскай мовы.

**Цяві́на** — сцябліна травы (травінка). Слова, дарэчы можа ўжывацца як параўнанне, тыпу: дзяўчына была тоненькая, як цявіна.

**Гучо́к** — маладая галінка, парастак. «Сена дастанем, насячом гучкоў, вецця, галін — не падохне жывёла», — пісаў Якуб Колас.

**Гонта** — дахавы матэрыял у форме невялікіх дошчачак.

**Адзін крок** — вельмі блізка, побач. Беларускія адпаведнікі — за два крокі, пад рукой. Руская — рукой подать, под самым носом.

**Хоць куды** — 1) вельмі добры (пра чалавека), які заслугоўвае высокай ацэнкі; 2) выдатна нешта зрабіць. Беларусы яшчэ скажуць: пашукаць такога, на ўсе сто, будзь здароў. Руская: хоть куда, без сучка без задоринки.

У якасці прыкладу прыгадаем радкі Петруся Броўкі:

*Паспрабуем распытацца*
*Мы пра даўнія гады.*
*Хоць Антону за сто дваццаць,*
*Але памяць — хоць куды...*

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
iost@zviazda.by

## Тэлесеткі

### ...Сваё, наша, любімае

**Тэлеканал СТБ падрыхтаваў для сваіх гледачоў прыемны сюрпрыз і ўжо за тыдзень да афіцыйнага свята абвясціў суботу 10 снежня Днём беларускага кіно.**

Кінаменю складзена з улікам самых розных густаў. Напрыклад, маленькія гледачы змогуць убачыць зборнік мультфільмаў і дзіцячы фільм «Прададзены смех» рэжысёра Леаніда Нячаева, дарослыя — айчынны каляндарны серыял «Ой, ма-мач-кі!..», меладраму «Рыфмуецца з любоўю» або старую добрую камедыю «Белыя Росы» (падкрэслім — менавіта старую, а не сучасны працяг гісторыі).

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

### Новы год у рэжыме нон-стоп

**«Тэлеканал Дзеда Мароза» змогуць паглядзець карыстальнікі інтэрактыўнага тэлебачання ZALA, паведамляюць у кампаніі «Белтэлекам».**

Адмысловы сезонны сямейна-дзіцячы інфармацыйны рэсурс круглсутачнага вяшчання з навагодняй і калядной тэматыкай з'явіцца ва ўсіх базавых пакетах і будзе транслявацца з 1 снежня гэтага года па 31 студзеня наступнага. На новым канале пакажуць савецкія, расійскія і замежныя мастацкія фільмы, мультфільмы, а таксама забаўляльна-пазнавальныя праграмы, у тым ліку майстар-класы па стварэнні дамашняга дэкору і святочных страў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
lyskavets@zviazda.by

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Дзейнічаць неабходна сумесна з надзейнымі партнёрамі, чым бы вы ні займаліся. У сераду магчымы некаторыя непаразуменні, але ўдасца спакойна і карэктна вырашыць іх. У чацвер жыццёва неабходна правільна выбудаваць адносіны з новымі калегамі або сябрамі, якія з'явіліся нядаўна. Не давайце нагоды лічыць сябе слабой асобай, якой можна маніпуляваць. У пятніцу вам будзе ўсміхацца ўдача, але верыць ёй не варта. У выхадныя дні паспрабуйце забяспечыць сабе максімальны спакой і адпачынак.



**СКАРПІЁН.** Вас чакаюць новыя цікавыя праекты, якія запатрабуюць ведаў, уменняў і творчага падыходу. Вам будзе цяжка сабрацца з думкамі, вызначыцца і нацэліцца на выкананне пастаўленых задач. Але ўсе намаганні акупяцца. Ваш аўтарытэт у прафесійным асяроддзі ўзрасце. У чацвер, перш чым прыняць якоенебудзь рашэнне, неабходна ўсё добра ўзважыць. Гэты дзень спрыяльны для людзей, якія выбралі літаратурную дзейнасць. У выхадныя парадуюць блізкія людзі.



**СТРАЛЕЦ.** Будзеце здольныя прыняць важнае і адказнае рашэнне, планамернае ўвасабленне якога ў жыццё вам дапаможа ажыццявіць нейкі таемны саюзнік. Не выключана, што вы зробіце камусьці неацэнную паслугу. У аўторак атрымаецца даказаць сваю надзейнасць і незаменнасць і на працы, і ў сям'і. Калі нейкая ідэя захопіць вашу свядомасць у чацвер або пятніцу, лепш пачакаць з яе рэалізацыяй, намаганні будуць выдаткаваныя марна. Выхадныя запатрабуюць разважлівасці і рацыянальнасці.



**КАЗЯРОГ.** Тыдзень пажадана прысвяціць падвядзенню прамежкавых вынікаў і да суботы не пачынаць нічога новага. Цяпер лёгка паддаюцца выпраўленню дапушчаныя раней пралікі і недахопы, але важна зразумець, што менавіта пайшло не так. Канкурэнты нагадаюць пра сваё існаванне ў сераду. У чацвер магчымы невялікі канфлікт з начальствам, паспрабуйце захоўваць спакой, і тады сітуацыя не паўплывае на вашу далейшую кар'еру. Пятніца — удалы дзень для складання планаў на блізкую і аддаленую будучыню.



**ВАДАЛЕЙ.** У пачатку тыдня варта праявіць адкрытасць і камунікабельнасць — гэта добры час для зносін, наладжвання кантактаў, атрымання выгадных парад. У справах будзе спадарожнічаць поспех, прычым, як ні дзіўна, перашкодзіць яму можа ваша ж уласная дыпламатычнасць. Грэбуйце ўмоўнасцямі, не спрабуйце завуаляваць вострыя куты, шчыра выказвайце сваё меркаванне — і ўсё ў вас атрымаецца. У другой палове тыдня магчыма далёкае падарожжа, што пагражае прывесці да рознагалоссяў з блізкімі людзьмі, але дапаможа атрымаць поспех у справах. У нядзелю сцеражыцеся грубасці і падаўлення ініцыятывы з боку іншых людзей.



**РЫБЫ.** Паспрабуйце не ўпадаць у крайнасці. Вы будзеце вельмі ўражлівыя і даволі крыўдлівыя ў гэтыя дні. Варта паклапаціцца пра тое, каб, мяркуючы, што вас недастаткова цэняць, вы не паспелі нагаварыць чагосьці, за што потым будзе сорамна. З іншага боку, залішняя самарэклама і эгаізм таксама не прывядуць ні да чаго добрага, таму лепш трымацца залатой сярэдзіны. Не адмаўляйцеся ад дапамогі блізкіх людзей. У асабістым жыцці зараз не ўсё гладка. Але вы здолееце ўладзіць канфлікт, які наспявае.

## Чацвер, 8 снежня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.00** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Дзень Бязгрэшнага Зачацця Дзевы Марыі.
**9.10, 22.15 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Пірат і піратка».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.20** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Буйным планам.
**0.55** Дзень спорту.
**1.10 Серыял «Пастка».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.10** Тэлебарометр.
**9.05, 22.15** «Анлайн 2.0». Скетчкам.
**9.35, 18.00 Дэтэктыў «Такая работа».**
**10.25, 20.20** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**11.25, 21.25 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**11.55, 17.00 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**12.50, 18.55** «Ікона стылю». Fashion-шоу.
**14.15** «Арол і рэшка. Нязведаная Еўропа». Трэвел-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 22.45 Дэтэктыў «Трынаццаць».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.50 Серыял «Косці».**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.35** «Беларуская кухня». Суп са шчаўя і яечня з абаранкамі.
**8.00, 11.45, 20.25** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.10 «Пастка». Драма.**
**9.05, 15.30 «Тартак». Кінааповесць.**
**10.25** «Святло далёкай зоркі». Памяці рэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Віктара Карпілава.
**10.55, 22.45** «Апаленыя ўладай. Драма Андрэя Андрэевіча». Дак. фільм.
**12.00** «Край».
**12.25** «Размовы пра духоўнае». Урачыстасць Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі (кат.).
**13.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.35, 21.05 «Мы жылі па суседстве». Кінааповесць.**
**14.50** «Адваротны бок Месяца». Дак. фільм.
**16.50, 22.20** «Дыя@блог». Пра мову.
**17.15** «Сустрэчы ў «Буквадзе».
**18.05** «Размаўляем па-беларуску».
**19.00 «Гваздзік». Драма.**
**20.00** «Эпоха Максіма Багдановіча».
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00, 18.45, 22.55** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Слэм-данк.
**8.35** «Два бакі алімпійскага медаля». Дар'я Навумава.
**9.05** Гандбол. SEHA-Газпрам ліга. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Металург» (Македонія).
**10.35** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**11.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. «Рэал» (Іспанія) — «Барусія» (Дортмунд, Германія).
**13.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. «Тотэнхэм» (Англія) — ЦСКА (Расія).
**15.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. Агляд.
**16.10, 1.05** Плаванне. Чэмпіянат свету на кароткай вадзе.
**18.15** Фактар сілы.
**18.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 6-ы тур. «Вільярэал» (Іспанія) — «Сцяуа» (Румынія).
**20.55, 23.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 6-ы тур.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Бесталковыя нататкі».
**19.00** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «Адваротны бок Месяца».**
**23.20** «На ноч гледзячы».
**0.20** «Давай пажэнімся!»
**1.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.35 «Следакі». Серыял.**
**16.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**16.50** «Мінск і мінчане».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.05** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**0.20 Маст. фільм «Парожні рэйс».**
**1.55** Дакументальны праект: «Вайна без правілаў».

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Маст. фільм «Інспектар ДАІ».**
**10.30 Маст. фільм «Каханне і страхі Марыі».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Разведчыцы».**
**16.10** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.05 Серыял «Дзявочае паляванне».**
**22.10 Маст. фільм «Ідэальная жонка».**
**0.00 Маст. фільм «Трое раз'юшаных мужчын».**
**3.10** «Іншы свет».
**3.40 Серыял «Невідзімкі».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Уся Расія».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Пятая група крыві».**
**19.10, 20.40 Серыял «Па гарачых слядах».**
**21.45, 23.10 Серыял «Тайны следства 15».**
**23.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**0.00** «Паядынак».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**7.25** «Студыя Юліі Высоцкай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Сышчыкі».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Апякун».**
**23.05** «НЗ.BY».
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Марскія д'яблы».**

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**11.00 Меладрама «Гонар і прадузятасць».**
**13.05 Серыял «Дзеці Арбата».**
**13.55** Дак. серыял «Дыялог з усім светам».
**14.25 Камедыя «Падарунак з характарам».**
**15.55, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.20** «Урокі дабрыні».
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.15 Серыял «Па той бок ваўкоў».**
**18.10 Серыял «Правіца Божая».**
**19.05** «Фэшн is my прафэшн».
**19.25 Серыял «Агент Картэр».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Баявік «Квант міласэрнасці».**
**23.10 Серыял «Ганібал».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Машкіны страшылкі».
**8.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны».
**9.40** Меладрама «Спытайце ў Сіндзі».
**11.40, 14.40, 19.10** Серыял «Атэль Элеон».
**12.50** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00** Серыял «Дах свету».
**15.50, 20.20** Серыял «Вечны водпуск».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**21.30** Камедыя «Таксі».
**23.30, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка».
**3.00** «Дурні і дарогі».
**4.00** «Лаві момант».
**4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**5.00** Скетчкам «Студэнты».
**5.30** «Мільёны ў сетцы».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 23.50** «Каломба». Серыял.
**12.50** «Не кватэра — музей». Мемарыяльны музей-кватэра У.У. Набокава.
**13.05** «Расія, любоў мая!» «Эвенкі — вечныя вандроўнікі».
**13.30** «Багач, бядняк...» Серыял.
**15.10, 22.35** «Карл Вялікі». Дак. фільм.
**16.05** «Абсалютны слых».
**16.50** «Больш чым каханне». Марцін Лютэр і Катарына фон Бора.
**17.30** Масіма Кварта, Юрый Башмет і камерны ансамбль «Салісты Масквы».
**18.30** Сусветныя скарбы.
**18.45** «Эрмітаж».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.10** 90 гадоў з дня нараджэння Рэзо Чхеідзэ. «Астравы».
**21.50** «Культурная рэвалюцыя».
**23.45** Мастсавет.
**1.25** П.І. Чайкоўскі. Скрыпічныя сола з балетаў «Спячая прыгажуня» і «Лебядзінае возера».

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Багаборніцтва па-савецку». 2006 год.
**6.50, 8.35, 9.40, 11.00, 14.30, 15.40, 17.00, 21.40, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.10** Дак. фільм «Вельмі вас усіх люблю».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.10** «Тэатральны раман» з Эдвардам Радзінскім. Маскоўскія тэатры ў 70-я гады...
